# ФАЛЬКЛОРНА-МІФАЛАГІЧНАЯ ТРАДЫЦЫЯ Ў МАСТАЦКАЙ СІСТЭМЕ АНТАНІНЫ ХАТЭНКА

**І. І. Шматкова**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*i.shmatkova@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца ўвасабленне фальклорна-міфалагічнай традыцыі ў творчасці Антаніны Хатэнка, якая пераасэнсоўвае ў сваіх вершах, паэмах, былічках, аповедах, прыпавесцях, эсэ народную спадчыну, выяўляе яе эстэтыку і духоўную каштоўнасць. Тэмы і вобразы са спрадвечнай беларускай культуры адлюстраваліся ў лірычна тонкім, метафарычна насычаным, гукава меладычным слове аўтара. Раскрываецца заглыбленасць А. Хатэнка на такіх філасофскіх катэгорыях, як жыццё і смерць, дабро і зло, прызначэнне паэтычнага слова. Фальклорныя топасы роду, сям'і, дому пераважаюць у яе мастацкім свеце, аснову якога складае фальклорна-міфалагічнае светабачанне.

***Ключавыя словы***: фальклорна-міфалагічная традыцыя; мастацкая сістэма; Антаніна Хатэнка; паэзія; проза; творчае ўвасабленне.

# ФОЛЬКЛОРНО-МИФОЛОГИЧЕСКАЯ ТРАДИЦИЯ В ХУДОЖЕСТВЕННОЙ СИСТЕМЕ АНТОНИНЫ ХОТЕНКО

**И. И. Шматкова**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный университет*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*i.shmatkova@gmail.com*

В статье рассматривается воплощение фольклорно-мифологической традиции в творчестве Антонины Хотенко, которая в своих стихотворениях, сказках, повестях, рассказах, притчах, очерках переосмысливает народное наследие, раскрывая его эстетику и духовную ценность. Темы и образы древней белорусской культуры нашли отражение в лирически тонком, метафорически насыщенном, звучаще-мелодичном слове автора. Раскрывается глубина представлений А. Хотенко о таких философских категориях, как жизнь и смерть, добро и зло, а также о назначении поэтического слова. В ее художественном мире, основанном на фольклорно-мифологическом мировоззрении, преобладают фольклорные топасы рода, семьи и дома.

***Ключевые слова***: фольклорно-мифологическая традиция; художественная система; Антонина Хатенко; поэзия; проза; творческое воплощение.

# FOLKLORE AND MYTHOLOGICAL TRADITION IN THE ARTISTIC SYSTEM OF ANTONINA KHATENKO

**I. I. Shmatkova**

*PhD, Ass. Prof.,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*i.shmatkova@gmail.com*

The article examines the embodiment of folklore and mythological tradition in the work of Antonina Khatenko, who reinterprets folk heritage in her poems, poems, fairy tales, stories, parables, essays, reveals its aesthetics and spiritual value. Themes and images from ancient Belarusian culture are reflected in the lyrically subtle, metaphorically rich, sonically subtle lyrical word of the author. The depth of A. Khatenko's understanding of such philosophical categories as life and death, good and evil, and the purpose of the poetic word is revealed. Folkloric topazes of the genus, family, and home prevail in her artistic world, the basis of which is a folklore and mythological worldview.

Keywords: folklore and mythological tradition, artistic system, Antonina Khatenko, poetry, prose, creative embodiment.

Каштоўнасці традыцыйнай народнай культуры асноватворныя і фундаментальныя. Як адзначае У. Конан, фальклор «быў на пачатку мастацкай культуры чалавецтва» [1, с. 27]. Сувязь мастацкай літаратуры з вусна-паэтычнай творчасцю даўняя, трывалая і плённая; яна вынік інтэнсіўнага ўзаемадзеяння і сінтэзу. «...Арыентацыя на фальклорныя традыцыі найбольш выразна выступае ў агульных сацыяльна-філасофскіх і маральна-этычных крытэрыях і ацэнках» і «прыводзіць да надзвычай прадуктыўных, эстэтычна-завершаных і гарманічных форм мастацкага ўвасаблення, якія прыдаюць твору непаўторны рэгіянальны каларыт і эмацыянальную актыўнасць» [2, с. 402 – 403].

У творчасці беларускай паэтэсы, этнакультуролага, публіцыста Антаніны Хатэнка надзвычай моцнае фальклорнае напаўненне. Гэта выяўляецца ў самім складзе вобразнага мыслення, адчуванні народнага самабытнага слова, тонкім лірызме, які характарызуецца напеўнасцю, прачулай інтанацыяй, гарманічным ладам рытму. Паглыбленне творцы ў фальклорную стыхію адбываецца праз рознааспектнае засваенне ідэйна-эстэтычнай спадчыны народа і яго духоўных каштоўнасцей (традыцыі эстэтычныя, традыцыі песеннасці, моўныя традыцыі); ёй уласцівы творчы зварот да фальклорных жанраў і выяўленчых сродкаў. Трэба заўважыць, што гэта не стылізацыя пад фальклор; для яе твораў ха-

рактэрны ўсвядомлены, мэтанакіраваны адбор вобразна-паэтычных форм і прыёмаў.

У творчасці Антаніны Хатэнка адчуваецца маральная заглыбленасць яе думкі-пачуцця, што бярэ пачатак са спрадвечнай народнай мудрасці. Аўтар спазнае нацыянальна-духоўныя асновы і традыцыі беларускага народа. Адна з мэт яе творчасці – спазнанне самой сябе: «я і Я», «Я ў бяссмерці і я ў жыцці», «часовая і вечная», «у Небе і на Зямлі» [3, с. 12 – 13], «Хто ж я? Подых? Зырчэнне? Попел?» [3, с. 78]. Для лірычнай гераіні вельмі важна не страціць сябе: «Спамінаю сябе самую. // І сама па сабе сумую» [3, с. 25]. Як і кожны сапраўдны творца, аўтар задаецца пытаннем аб сваім прызначэнні («Што ў далёкасць перадам? // Ясная мая ''відушчасць» [3, с. 40]), аб сэнсе жыцця («Жыццё маё – дар ці адплата?» [3, с. 94]).

Пры пошуку адказа на пытанне: «Хто ты? Скуль Прадрэва тваё расце?» [3, с. 78], – паэтэса звяртаецца да вобраза дрэва. Яна ўспрымае дрэвы, кветкі як блізкія істоты, якія падобныя да людзей, жывёл: «Як птушкі, грывастыя дрэвы, // здаецца, за хмары лятуць" [3, с. 20]. Вобраз дрэва ў мастацкай сістэме А. Хатэнка часта карэлюецца з небам: «Дрэвы і неба ўвайшлі ў мой пакой. // Неба і дрэвы…» [3, с. 61].

Вобразы дрэў, лесу невыпадкова так шырока прадстаўлены як у фальклоры, так і ў беларускай паэзіі. Дрэва ў сусветнай культуры заўсёды сімвалізавала жыццё, а «ў жыцці славяніна, які жыў ва ўмеранай зоне сярод лясоў, адыгрывала істотную ролю» [4, с. 24]. Успамінаецца народная прымаўка: «Беларус нараджаецца на дрэве і памірае на дрэве». Дэндралагічная тэма яскрава прасочваецца ва ўсёй беларускай літаратуры. Класічныя прыклады звароту да вобразаў дрэў: у паэзіі Янкі Купалы гэта бяроза, у Якуба Коласа – вярба «ад самых першых твораў і да апошніх паўставала ...нейкай эмблемай» [5, с. 139], у М. Багдановіча – «квецень вішні або чарэшні» [5, с. 140].

Увогуле, што тычыцца беларускай жаночай паэзіі, то тут сувязь вельмі празрыстая. Архетып сусветнага дрэва заўсёды суадносіўся з жаночым (мацярынскім) пачаткам. Нават большасць назваў дрэў – словы жаночага роду.

Сугучча ўзмацняе ў вершаваным творы А. Хатэнка сімвалізм слоў «лес» і «лёс»: «Дамоў два блуканцы брылі. // Па лёсе, нібыта па лесе…» [3, с. 21]. Адметная ў гэтым творы мэта – трапіць дамоў, прычым у вершах паэтэсы часта ў значэнні «дома» ўжываецца форма «ўдома». Нават у сне, знаходзячыся ў раю, лірычная гераіня думае пра дом: «Дамоў, напэўна, хочаш? // Там нават сцены й тыя суграюць. // Там летуценні зваблівa ласкочуць…» [3, с. 27].

Імкненне чалавека вярнуцца дамоў – туды, дзе і сцены лякуюць, – срадвечнае: «Не дай мяне, мама, дзе я непрывычна!» [3, с. 22]. Родны дом выступае адным з вядучых топасаў як у народнай творчасці, так і ў паэзіі А. Хатэнка: «Бывай, мой дом, бывай // свяці мой дом, свяці» [3 с. 44].

Дом як месца сілы выступае толькі тады, калі яно асвечана агнём продкаў, роду: «А дзе мы ўдома? // І з дзядамі ўдома» [3, с. 45]. Продкі, дзяды, маці з бацькам – тое, што звязвае чалавека з домам, родам, радзімай. Пяшчотна паўстае вобраз маці паэтэсы ў яе асабістых абрысах твару: «Пазнаю ў люстэрку маму. // Тонкай зморшчынкі прамень // праз няшчады і падманы // прасвятляецца ўва мне» [3, с. 47]. Вобраз жанчыны-маці, мацярынскага ўспрымання свету з асаблівай выразнасцю ўвасоблены ў паэзіі А. Хатэнка. Вобразы маці, бацькі, дзяцей, традыцыйныя для вуснай народнай творчасці, з'ўляюцца ідэяўтваральнымі ў творчасці паэтэсы.

Беларускі літаратуразнаўца Генадзь Праневіч звярнуў увагу на сакральную ўзаемасувязь паміж словамі маці і Радзіма: «Род (тварэц, бог Святла і ўсяго Сусвету ва ўсходніх славян) + ма (у санскр. Маці), парадзіха – тая, што нараджае, дае жыццё, з'яўляецца працягам Рода-творцы. У далейшым гэта паняцце трывала замацавалася за месцам, дзе адбываецца акт Боскага тварэння, з'яўленне чалавека на свет» [6, с. 28]. У гэтай сувязі бачыцца слушным меркаванне Т. Чабан, якая выказвае думку: «У процівагу выдаткам "эмансіпацыі" і "фемінізацыі" ўвагу паэтэсы прыцягвае матыў традыцыйнай жаночай долі – долі маці, жонкі, самаахвярнай захавальніцы дому, роду, ачага. Гэты матыў звязваецца А. Хатэнка, у першую чаргу, з праблемамі захавання і зберажэння нашага агульнага зямнога дому, міру на планеце, з мацярынскай любоўю да ўсяго жывога (спрадвечны архетып – Маці свету)» [7, с. 12].

Род бадай што магістральны вобраз творчасці А. Хатэнка, тая канстанта, повязь з якой у паэтэсы непарыўная; гэта тое, што дапамагае жыць: «Родам угрэты шлях» [3, с. 119]; тое, што нараджае паэзію: «Прабіваецца голас Роду // ў перастыглы бяздон-спакой…» [3, с. 128]; тое, што аберагае: «Барані, Родзе, нас, барані!» [3, с. 77]; тое, што чакае нас у канцы шляху: «Забяры мяне, Род, забяры!» [3, с. 77]. Род для аўтара – «плынь ад вытокаў да вусця» [3, с. 149]. Вакол Роду змыкаецца і пытанне лірычнай гераіні аб пошуках сябе: «Кім я вярнуся ва ўлонне Радзімы?» [3, с. 148]. Амаль на ўсе жыццёвыя пытанні аўтарка шукае адказ у Рода, у тым ліку і аб прычыне Чарнобыльскай трагедыі: «Ой, скажы ж нам, Родзе, скажы, // скуль атрута, з якіх прарэхаў?..» [3, с. 139], «Цалавала жанчына крыж // Вечны Род над зямлёю вітала // Як ты спіш, мой Родзе, як спіш // пад чарнобыльскай навалай?» [3, с. 136].

Канцэптуальнасць фальклорна-эстэтычнага светаасэнсавання ў мастацка-вобразнай сістэме А. Хатэнка заключаецца ў арыентацыі на традыцыйныя народныя каштоўнасці. Асаблівая духоўная значнасць ёй надаецца народным святам, якія цесна зніталіся з хрысціянскімі, іх штогадоваму колу, якое здаўна ўспрымалася як сімвал гармоніі: Каляды, Грамніцы, Вербніца, Вялікдзень, Радаўніца, Троіца, Купалле, Пакравы, Дзяды…

Слова «свята» ў А. Хатэнка перакрыжоўваецца са словам «сьвятаянне» – так называецца першы раздзел яе паэтычнага зборніка «Вербніца», дзе хрысціянскую і народную традыцыю аб'ядналі агульныя маральна-духоўныя каштоўнасці, як, напрыклад, у вершы «Сьвятаянне»: «Вянчанне Неба і Зямлі. Змаганне ліха і Дабра. // Да Вышы вечыстае шлях. // Купалле. Росаў чысціня… <…> Купалле. Мост ад нас да Нас. Ад нематы да Цішыні. Ад // забыцця да Ўсёзліцця. // Ад бездарожжа ў Ладспакой… // Купалле. След часоў былых. У космас узнясенне-спеў. // Вяршыня Духу. Дых эпох. // І глыбіня. І Выш. І Бог» [3, с. 86]. Як і ў фальклорнай творчасці, так і ў паэме «Весніца» А. Хатэнка народная традыцыя пераплятаецца з хрысціянскай праз адзінства вобразаў крыжа і Рода, крыж разам з ахвярай Ісуса Хрыста мае сімвалічнае значэнне наканавання, жыццёвага шляху, цэнтра Зямлі, яднання Зямлі і Неба.

Свята Грамніцы мае адметны сплаў сімволікі: у хрысціянстве гэта сустрэча Ісуса Хрыста (носьбіта Новага Запавету) з прадстаўнікамі Старога Запавету, а ў народным календары – сустрэча зімы з летам, свята ў гонар язычніцкага бога Грамаўніка (Перуна), таму па традыцыі лічылася, што з гэтага дня можна было пачуць грымоты. У аднайменным вершы А. Хатэнка зноў назіраем цесную повязь традыцый: «Там, на Божай гары, // там, дзе спеюць вятры, // дзень – накрэслены штрых, // што згараегарыць // у дакорах старых» [3, с. 122].

Сакавітымі эпітэтамі і метафарамі аздабляе ў сваім вершы А. Хатэнка асеннняе свята Пакравоў: «І пад покрывам ясна-празрыстым // развітальна пазвоньвае лісце. // Так ступала па ходніках маці – // чутна ледзьве, каб цішу не ўтраціць. // Так сыходзяць з нябёсаў Пакровы. // Свет у сне задумляецца знову. // Дайце ўслухацца эракружэнню // ў шапаценне здзіўлёных імгненняў!..» [3, с. 127]. Тут зноў жа арганічна спалучаецца народная традыцыя ўкрывання зямлі апалым лісцем на зіму, ільдом вады і г. д. з хрысціянскім вобразам Божай Маці, якая ахоўвае ўсё чалавецтва пад сваім пакровам.

Такім чынам, фальклорна-міфалагічная традыцыя для беларускай паэтэсы – крыніца каштоўнага народнага вопыту. Цікавасць да народных вытокаў невыпадковая, бо менавіта ў фальклоры сканцэнтраваны шматвяковы, правераны многімі пакаленнямі маральна-этычны вопыт бела-

рускага народа. Творца не капіруе сюжэты з фальклору, а пераасэнсоўвае іх, у асобных выпадках нават не прытрымліваючыся канонаў народнай традыцыі і прапаноўваючы свой, арыгінальны погляд на жыццё і рэчаіснасць.

Зварот да фальклору даў магчымасць А. Хатэнка ўвасобіць традыцыйныя народныя каштоўнасці, сцвердзіць і паказаць іх непераходнасць для маральна-этычнага быцця чалавека. У мастацкім вобразным слове аўтар творча пераўтварыла духоўны вопыт мінулага, спалучыла агульназначнае і асабістае, унесла свой унутраны досвед у трактоўку тэмы ці вобраза; пераасэнсавала фальклор праз творчую трансфармацыю ў паэтычны свет традыцыйных вобразаў і матываў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Конан У.* Ля вытокаў самапазнання: стаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мінск: Маст. літ., 1989.

2. *Грынчык М. М.* Фальклор і літаратура // Беларуская вуснапаэтычная творчасць / К. П. Кабашнікаў [і інш.]. 2-е выд., перапрац. Мінск: Вышэйш. шк., 1988. С. 389–404.

3. *Хатэнка А.* Вербніца Мінск: Кнігазбор, 2022.

4. *Швед І. А.* Раслінныя сімвалы беларускага фальклору. Брэст: Выд-ва Брэст. дзярж. ун-та, 2000.

5. *Чарота І. А.* Пошук спрадвечнай існасці: беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння. Мінск: Навука і тэхніка, 1995.

6. Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету: зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 24–25 мая 2007 г. / Мазырскі пед. ун-т імя І. П. Шамякіна; адк. рэд. А.У.Сузько. Мазыр: УА МДПУ, 2007.

7. *Чабан Т. К., Гарадніцкі Я. А.* Сучасная паэзія і фальклор. АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. Мінск: Навука і тэхніка, 1988.